# ЯСЮКАЙЦЬ АНТОН АЛЯКСАНДРАВІЧ



Беларускі мастак. Член Беларускага Саюза мастакоў (1977). Нарадзіўся 01.03.1944 года ў в. Навіянка. Вучыўся ў Канвелішскай сярэдняй школе. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут (1970). З 1970 года працуе выкладчыкам Бабруйскага прафесійна-тэхнічнага мастацкага каледжа. У мастацкіх выставах удзельнічае з 1967 года. Працуе пераважна ў тэхніцы акварэлі, у жанры пейзажа і нацюрморта. Творам уласцівы паэтызацыя сюжэта, мяккасць каларыту. Найбольш значныя акварэлі: "Вячэрняя цішыня" (19680, "Раніца ў Лучосе" і "Зімовы вечар" (1969), "Вячэрнія цені" (1972), "Азёрны край. Віцебшчына" (1975), "Вясна 1945 года" і "Поле, поле…" (1979), "Чырвонае поле" (1984), "Вехі на рацэ Проня" (1985), серыі "Саяна-Шушанская ГЭС" (1975), "Космас" (1976), "Па Югаславіі" і "Мой кут" (1980), "Па Таймыры" (1983). Аўтар жывапісных палотнаў "На буравой", "Вытокі", "Восеньскі вечар" і "Зорка Венера" (1981). Землякі лічаць найбольш знакамітай карціну Антона Аляксандравіча "Перад дажджом у Навіянцы" (1999).

**Бібліяграфія:**


1. Гугнін, М.А. Ясюкайць Антон Аляксандравіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т.5. – Мінск, 1987. – С. 699.
2. Кулдаш, Я. Мастак з Навіянкі // Воранаўская газета. – 1999. – 1 верасня. – С.3.
3. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раена / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал.рэд.) і інш.; мастак Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн., 2004. – С. 435.
4. Сакадынец, М. Антон Ясюкайть: «Родина во мне» // Воранаўская газета. – 2004. – 1 верасня. – С.2.
5. Сакадынец, М. Антон Ясюкайть: «Родина во мне» // Бабруйскае жыццё. – 2004. – 2 красавіка. – С.3.
6. Шаранговіч, Н. Жывапісны рэалізм Антона Ясюкайця // Мастацтва. – 2005. — №2. – С. 18—19.